Баброўская Д.В., студ. гр. 501ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.,
кандыдат філалагічных навук

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ АКАЗІЯНАЛЬНАЙ АБРАДАСЦІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫЦЫ

Даследчыкі характарызуюць аказіянальную абраднасць, як адну з найменш вывучаных сфер культуры, пры тым, што яна ўтрымлівае найбольш архаічныя элементы традыцыйнай культуры, цесна спалучана з міфалагічнымі ўяўленнямі чалавека.

Пачатак збору матэрыялу па аказіянальнай абраднасці былі зроблены класікамі фалькларыстыкі ў XIX – пачатку XX ст. П.М. Шпілеўскі ўзгадаў у сваёй працы «Беларусь у характарыстычнх апісаннях і яе фантастычных казках» (1854) узгадаў асобныя праяўленні аказіянальнай абраднасці. Напрыклад, «каб разагнаць хмары ці спыніць дождж, аб’язджаюць тры разы вакол дома на драўляной лапаце» [10, с.62]. Каштоўны этнаграфічны матэрыял прадстаўляе праца А.Я. Багдановіча «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў» (1895), у якой адзначаецца, што па значнасці другім пасля абворвання спосабам засцеражэння супраць мора беларусы лічаць выраб абыдзённіка. «Калі абнесці вакол ахопленага агнём дома хлеб, то агонь не будзе далей пашырацца. Некаторыя, абнёсшы хлеб вакол дома, кідаюць яго ў агонь, лічачы, што тады пажар спыніцца» [5, с. 22]. А.Я. Багдановіч засяроджвае ўвагу на рэліктах старажытных форм рэлігіі ў абрадах беларусаў. Характарызуючы светапогляд носьбітаў традыцыі, даследчык звяртаецца да вытокаў фетышызму, анімізму, перажыткаў адухаўленняў і сонечнага культу. Багаты каляндарна-абрадавы матэрыял сабраны П. Шэйнам і яго шматлікімі карэспандэнтамі. У кн. 4 т. «Матэрыялы для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (1902) паведамляецца, што калі доўга няма дажджу, то жанчыны ўсёй вёскі збіраюцца ў адну хату з раніцы да вечару пралі кудзелю, і ткалі ручнік, які і

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

называўся абыдзённікам. «Гэты абыдзённік неслі ў храм, прысячы Бога паслаць на зямлю дождж» [11, с.18]. Па звестках Е.Р. Раманава, прыведзеных у працы «Беларускі зборнік» (1912), дзеля забеспячэння абароны ад удараў маланкі, якая магла выклікаць пажар, праводзіліся абрады, звязаныя з захаваннем грамавых стрэл. Аўтар паведамляе, што ў час пажару беларусы абносяць вакол пажарышча і кідаюць ў агонь асвечанае вялікоднае яйка, якое некаторыя старыя жанчыны адмыслова захоўваюць дзеля такіх выпадкаў [7, с. 302]. Значнай па колькасці і якасці сабранага матэрыялу з'яўляецца праца А.К. Сержпутоўскага «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» (1930), у якой змешчаны 2275 запісаў лнгенд і паданняў, прымхаў і забабонаў, зробленых аўтарам на працягу 40 гадоў на Случчыне. А.К. Сержпутоўскі адзначае, што падчас засухі для выклікання дажджу сыпалі ў калодзеж або ў раку мак [8, с. 19].

Здабыткі класікаў беларускай фалькларыстыкі сістэматызаваны ў працы У.А. Васілевіча «Зямля стаіць пасярод свету» (1996) («Беларускія прыкметы і павер'і», кн.1). Выданне служыць своеасаблівым арыенцірам пры пошуку звестак па аказіянальнай абраднасці.

У савецкай фалькларыстыцы на розных этапах яе развіцця амаль адсутнічала навуковая цікавасць да аказіянальнай абраднасці беларусаў. У кантэксце гістарыяграфіі другой палавіны ХХ ст. надзвычай каштоўным выданнем па аказіянальнай абраднасці з'яўляюцца этналінгвістычны слоўнік «Славянские древности» (1995–2009) і энцыклапедычны слоўнік «Міфалогія беларусаў» (2011). Канцэптуальныя палажэнні сфармуляваны ў артыкулах беларускіх даследчыкаў Т. Валодзінай, У. Васілевіча, С. Санько, І. Клімовіч, Л. Дучыц, Э. Зайкоўскага. Неабходна асобна адзначыць працу «Нататкі па славянскаму язычніцтву» М. і С. Талстых, фактычную аснову якой склалі палявыя запісы даследчыкаў, зробленыя на працягу 1947–1976 гг. на Палессі [9, с. 91].

Багаты фактычны матэрыял пра аказіянальныя абрады і ў кантэксце іншых відамі беларускай абраднасці апублікаваў У.А. Лобач у «Полацкім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнаграфічным зборніку» (2011). Яго складаюць каля 1500 аўтэнтычных запісаў, зробленых падчас палявых экспедыцый 1992–2010 гг. на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Шырокі спектр тэм па гэтай праблематыцы даследаваны М.А. Бабчанок: семантыка беларускай аказіянальнай абраднасці і яе вербальнага кампанента, спецыфіка адпаведных тыпалагічных груп абрадаў (метэаралагічных, медыцынскіх, бытавых), напрамкі трансфармацыі аказіянальнай абраднасці.

Аналіз навуковай літаратуры па тэме даследавання паказвае, што канцэптуальныя асновы міфалагічнай свядомасці, на якой грунтуецца комплекс рэгулярных і аказіянальных абрадаў, у сучаснай навуцы асэнсаваны. Аднак аказіянальная абраднасць усё яшчэ з’яўляецца адной з найменш вывучаных сфер традыцыйнай беларускай культуры.

Спіс выкарыстаных крыніц:


1. Антропов, Н.П. Белорусские этнолингвистические этюды: 2. Вызывание дождя (акциональный код) // Язык и культура: Семантика и грамматика. К 80-летию академика Н.И. Толстого. – Москва: Индрик, 2004. – С. 30–52.

2. Бабчанок, М.А. Жанры беларускіх аказіянальных тэкстаў / М.А. Бабчанок // Проблемы методологии социогуманит. познания: диалектика и герменевтика: Матер. междун. консилиума, 14 мая 2009 г., Мінск: БГПУ, – С. 175–178.

3. Бабчонак, М.А. Сутнасць і змест метэаралагічных аказіянальных абрадаў / М.А. Бабчонак // Весці. Мінск: БДПУ, Сер. 1. – 2008. – №. 1. – С. 86–88.

4. Бабчонак, М.А.Трансфармацыя беларускай аказіянальнай абраднасці / М.Бабчонак // Весці. Мінск: БДПУ, Сер. 1. 2009. №. 2. – С. 86–90

5. Багдановіч, А.Я. Перажыткі старажытнага светапогляду ў беларусаў. Этнаграфічны нарыс / А.Я. Багдановіч. – Мінск: Беларусь, 1995. – 187 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Полацкі этнаграфічны зборнік склад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2ч. Ч. 2. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – 368 с.

7. Романов Е.Р. Белорусский сборник. Быт беларуса. Опыт словаря условных языков Белоруссии / Е.Р. Раманаў. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1912. –Вып. 8. – 734 с.

8. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

9. Толстой, Н.И., Толстая, С.М. Заметки по славянскому язычеству Вызывание дождя в Полесье // Славянский и балканский фольклор Генезис. Архаика. Традиции. – М, 1987. – С. 89–120

10. Шпілеўскі, П.М. Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычныя яе казках / П.М. Шпілеўскі. – Пантэон. – Спб., 1854. – 119 с.

Шэйн, П.В. Матэрыялы для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю / П.В. Шэйн. – Віцебск: Губернская Тыпа-Літаграфія, 1902. – 632 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ